УДК 001(476)+930(476)

*П.Ф. ДЗМІТРАЧКОЎ*

# АБ РАЗВІЦЦІ НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ І ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII стст.

У гісторыі навукі, развіцці грамадскай думкі Беларусі другая палова XIII – першая палова XVII стст. займае важнае месца. Гэта быў перыяд, калі беларускія землі былі ўключаны ў склад Вялікага Княства Літоўскага, а потым і Рэчы Паспалітай, пашырылі свае сувязі з еўрапейскімі краінамі і ў іх духоўным жыцці адбыліся істотныя змены. Гэтыя змены прасочваюцца як у навуковай сферы, так і ў развіцці грамадскай думкі. Безумоўна, аб навуцы ў сучасным яе разуменні ў дачыненні да таго часу мы не можам гаварыць. Але тады, як і раней, ішло назапашванне ведаў аб навакольным свеце, прыродных з'явах, грамадскіх працэсах, рабіліся спробы асэнсаваць атрыманыя веды, зрабіць адпаведныя высновы і абагульненні, а гэта значыць, што закладваліся асновы навукі і навуковыя веды станавіліся важнейшай часткай усёй культуры. Адначасова развівалася і грамадская думка, фарміраваўся пэўны светапогляд людзей. Чалавек заўсёды імкнуўся «познать природу сущего», самога сябе, абгрунтаваць адпаведныя маральныя прынцыпы і духоўныя ідэалы, свой погляд на сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя і іншыя пытанні.

Усё гэта было характэрна і для аналізуемага намі перыяду. Нягледзячы на абмежаванасць крыніц, фрагментарнасць звестак, мы маем магчымасць прасачыць, па якіх накірунках тады развіваліся навуковая веды на Беларусі, які быў стан грамадскай думкі, што новага з'явілася тут, якія праблемы хвалявалі людзей. Так, ёсць падставы сцвярджаць, што вялікую цікавасць насельніцтва Беларусі ўжо ў той час прыцягвала мінулае, гісторыя тых земляў, на якіх яны пражывалі. Іх уяўленні аб гэтай мінуўшчыне адлюстроўваліся як у фальклорных матэрыялах, так і пісьмовых дакументах, гістарычных творах. У беларускім фальклоры, як сведчаць даследаванні, мелася шмат твораў эпічнага, гераічнага цыклаў (легенд, паданняў, гістарычных песен, балад, інш.), што склаліся яшчэ раней, у старажытнарускі перыяд, і ў іх, акрамя агульнаславянскіх сюжэтаў, зафіксаваны

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

былі таксама многія падзеі, якія адбываліся на беларускіх землях. Такія творы захаваліся і пазней, пры гэтым асноўнымі тэмамі заставаліся барацьба са знешнімі ворагамі (мангола-татарамі, крыжакамі), канфлікты з Маскоўскай дзяржавай, услаўленне гераічных падзей мінулага. Напрыклад, у канцы XVI – першай палове XVII стст. у беларускім фальклоры, у прыватнасці, у песеннай творчасці, знайшла адлюстраванне казацкая тэматыка. Так, перамозе запарожскіх казакоў Севярына Налівайкі над «ляшскім» войскам у 1595 г. прысвечана песня «Ой, у горадзе Магілёве дымам пацягнула». У гэты ж час у творах вуснай народнай творчасці пачынаюць гучаць і сацыяльныя матывы, адлюстроўваюцца цяжкія ўмовы жыцця народа [1].

Важную ролю ў развіцці гістарычных ведаў, фарміраванні гістарычных уяўленняў адыгралі летапісы. Іх з'яўленне можна лічыць новым этапам у гэтым працэсе. Падзеі, якія адбываліся на беларускіх землях у другой палове XIII ст., знайшлі адлюстраванне ўжо ў некаторых летапісах старажытнарускага часу (Галіцка-Валынскі летапіс), але асабліва важнае значэнне для нашай гісторыі мелі летапісы, што з'явіліся ў ВКЛ. Летапісы ўвогуле – гэта не толькі помнікі літаратуры, пісьмовыя крыніцы, гэта і своеасаблівыя гістарычныя творы. Адметнай рысай летапісаў таго часу (перш за ўсё летапісных зводаў) было тое, што ў цэнтры апісанняў стаяла гісторыя ВКЛ, усе асноўныя аспекты гэтай гісторыі і, безумоўна, падзеі на Беларусі. Прычым аўтары падаюць нам сваё разуменне ВКЛ як дзяржавы, прычын яе ўзнікнення, услаўляюць дзейнасць вялікіх князёў літоўскіх. Яны праводзілі ідэю гістарычнай еднасці славян і абгрунтоўвалі заканамернасць іх аб'яднання ў складзе ВКЛ, якое лічылі цэнтрам збірання ўсіх усходнеславянскіх зямель. А гэта было вельмі важна для правячых колаў, якія тады вялі актыўную барацьбу за «рускія» землі. Летапісы, адзначаюць даследчыкі, давалі палітыка-ідэалагічнае і гістарычнае абгрунтаванне правоў вялікіх князёў літоўскіх на ўсе ўсходнеславянскія землі. У летапісах (асабліва ў другім летапісным зводзе) была зроблена спроба раскрыць і паходжанне літоўскай знаці, што павінна было ўзмацніць яе дынастычныя і палітычныя пазіцыі. У летапісах XV – XVI стст. знайшлі тлумачэнне і многія іншыя пытанні беларускай гісторыі, гісторыі ВКЛ, у тым ліку і падзеі мясцовага значэння (Баркулабаўская хроніка, інш.).

Для развіцця гістарычных ведаў, станаўлення гісторыі як навукі, важнае значэнне мелі творы, аўтарамі якіх былі замежныя вучоныя. Так, першым гісторыкам ВКЛ можна лічыць М.Стрыйкоўскага, хроніка якога карысталася папулярнасцю на ўсіх усходнеславянскіх землях, г. зн., на Беларусі, Украіне, Расіі, і служыла крыніцай для многіх навукоўцаў. Вядома была ў XVI ст. і «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» А.Гваньіні. Гэта быў першы твор, які знаёміў заходнееўрапейцаў з гісторыяй ВКЛ, ён быў вядомы і на Беларусі. На тэрыторыі нашай краіны мелі тады распаўсюджанне і храналагічныя зводы аб падзеях усеагульнай гісторыі, творы, перакладзеныя з іншых моў (Гісторыя аб Траянскай вайне, Гісторыя іудзейскай вайны Іосіфа Флавія, інш.). Гістарычныя аспекты знайшлі таксама адлюстраванне ў творах грамадска-палітычнай і царкоўна-рэлігійнай публіцыстыкі. Гэтыя творы падымалі вострыя дыскусійныя пытанні і тым самым спрыялі абуджэнню грамадскай актыўнасці беларускага народа, фарміраванню яго гістарычнай і этнічнай свядомасці, распаўсюджанню на Беларусі рэнесансных, гуманістычных ідэй.

Паступова назапашваліся і абагачаліся веды па археалогіі, крыніцазнаўстве, этнаграфіі, краязнаўстве. Так, пэўныя звесткі аб помніках старажытнасці, побыце і культуры, розных баках жыцця жыхароў сельскіх і гарадскіх пасяленняў Беларусі змяшчаліся ў летапісах і хроніках, запісках сучаснікаў, іншаземцаў, якія пражывалі на тэрыторыі ВКЛ ці падарожнічалі па ёй. Напрыклад, першыя этнаграфічныя матэрыялы аб насельніцтве беларускіх земляў з'явіліся ў старажытнарускіх летапісах; летапісы XIV – XVI ст.ст. адлюстроўваюць ужо больш шырокую як

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

гістарычную, так і этнічную сітуацыю на Беларусі. Даволі разнастайныя звесткі мы можам знайсці ў «Записках о московитских делах» (СПб., 1908, першая публікацыя ў 1549 г. у Вене) пасла Рымскай імперыі С.Герберштэйна (яго шлях пралягаў праз Беларусь). Звесткі аб побыце жыхароў Заслаўя, Радашковіч, Дуброўна і прылеглых да іх мясцовасцей змешчаны ў кнізе польскага гісторыка і этнографа Яна Ласіцкага (1534 – 1600 гг.) «О религии, жертвоприношениях, свадебные, похоронные обряды русинов, московитов и татар. Из трудов разных писателей...» (1582). Аўтар каля 30 гадоў працаваў настаўнікам ва ўладаннях Я.Глебавіча ў Заслаўі. Зборнік беларускіх прыказак і прымавак XVI – пачатку XVII стст. (на польскай і лацінскай мовах, дарэчы, гэта быў першы такі зборнік) выдаў Саламон Рысінскі, які працаваў настаўнікам у Дзяляцічах і Любчы [2, с. 61].

Высокага ўзроўню развіцця дасягнула ў той перыяд педагагічная думка. Яна абагачалася самім народам і перш за ўсё праз фальклорныя творы. Народная педагагічная мудрасць (К. Ушынскі назваў народ педагагічным геніем) знаходзіла сваё ўвасабленне ў многіх помніках вусна-паэтычнай творчасці і, у прыватнасці, у прыказках, прымаўках, песнях, казках. Усе яны з'яўляліся ў той перыяд сродкамі не толькі развіцця мовы, мыслення дзяцей, але мелі і вялікае выхаваўчае значэнне, фарміравалі павагу да старэйшых, бацькоў, уяўленні пра дабро і зло, ролю працы, розныя прадметы і з'явы прыроды.

Яшчэ большае ўздзеянне на педагагічную думку аказала развіццё на Беларусі школьнай справы і асветы. Адкрыццё навучальных устаноў паставіла на парадак дня шэраг пытанняў як па арганізацыі вучэбнага працэсу, так і па забяспячэнні яго настаўнікамі, праграмамі, падручнікамі, дапаможнікамі. Даследаванні, праведзеныя беларускімі навукоўцамі, сведчаць, што ўсе гэтыя пытанні вырашаліся не толькі на аснове мясцовых традыцый, але і з улікам еўрапейскага вопыту, ідэй і прынцыпаў, прыўнесеных эпохай Адраджэння і Рэфармацыі. Так, з шырокай да свайго часу праграмай асветніцтва на гуманістычнай аснове выступіў Ф.Скарына. Ён першы з нашых мысліцеляў зразумеў неабходнасць даць асвету «простым людзям пасполитым», гэта значыць самым розным слаям насельніцтва, а не толькі шляхецкім саслоўям. Прычым у гэтых мэтах ён выкарыстоўваў Біблію, рэлігійныя кнігі. Ф.Скарына разглядаў Біблію як крыніцу самых розных ведаў і рэкамендаваў яе ў якасці дапаможніка па вывучэнні не толькі «семи свободных наук», але таксама гісторыі, геаграфіі, медыцыны, права, этыкі, філасофіі. У выказваннях і каментарыях Ф.Скарына праводзіў думку, што кожны чалавек можа сам набыць веды, мудрасць з дапамогай кніг. Ён нават рэкамендаваў пэўны парадак, паслядоўнасць у вывучэнні кніг Бібліі.

Важны ўклад у развіццё педагагічнай думкі, тэорыі і практыкі навучання ўнёс Сымон Будны – адзін з найбольш актыўных удзельнікаў рэфармацыйнага руху на Беларусі. Ён разам са сваімі прыхільнікамі Лаўрэнціем Крышкоўскім, Мацеем Кавячынскім, Янам Намыслоўскім не толькі разгарнуў актыўную дзейнасць па заснаванні навучальных устаноў на Беларусі, але і наладзіў выпуск кніг, вучэбнай літаратуры, неабходнай для навучання. Яго «Катехизис», які быў выдадзены ў 1562 г., стаў па сутнасці першым школьным падручнікам на беларускай мове. С.Будны, як і Ф.Скарына, быў прыхільнікам асветы для ўсяго народа і шмат зрабіў ў гэтым напрамку. Ён клапаціўся аб тым, каб народная асвета стала справай усяго грамадства, усіх сацыяльных слаёў, у тым ліку і самой дзяржавы. «Каждый господарь, – пісаў ён, – цар ли, княз ли, воевода ли, или боярин, или мещанин, што бы только мел подданных... повинен, мовлю, им ене три речи: наперней выхованнье, потым науку, а третье наказанье» [3, с. 20]. С.Будны першым выступіў супраць манаполіі царквы ў галіне адукацыі, рашуча пратэставаў супраць адарванай ад жыцця царкоўна-манастырскай сістэмы навучання, якая давала вучням

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

мізэрныя, абмежаваныя веды. Моладзь, лічыў ён, павінна атрымоўваць свецкую адукацыю і «промежки людей жити», а не «по кельям... дремати, або блудити». Школы, якія былі адчынены ўдзельнікамі рэфармацыйнага руху на Беларусі (кальвінісцкія, арыянскія) па аднадушнай ацэнцы гісторыкаў, выдзяляліся добра прадуманай арганізацыйнай структурай вучэбнага працэсу, методыкай выкладання, давалі сваім вучням не толькі веды, але і выхоўвалі ў іх вольнадумства, рэлігійны скептыцызм, павагу да чалавечага розуму.

Актыўна займаўся пытаннямі асветы і Васіль Цяпінскі, таксама адзін з буйнейшых прадстаўнікоў рэфармацыйнага руху на Беларусі, яго радыкальнага крыла. Заслугай В.Цяпінскага, лічаць даследчыкі, было тое, што ён абгрунтаваў неабходнасць стварэння нацыянальнай школы, з патрыятычных пазіцый імкнуўся вырашаць пытанні асветы і адукацыі. «Як асветнік-гуманіст, – адзначае А.Коршунаў, – Цяпінскі ў сваіх грамадска-палітычных і асветніцкіх поглядах пайшоў значна далей, чым Скарына і Будны. Ён досыць шырока развіваў думку аб значэнні асветы на роднай мове, пераканаўча і смела ставіў пытанне аб арганізацыі школ для дзяцей простага люду, узнімаўся да разумення неабходнасці шляхам адукацыі абуджаць і развіваць у народзе пачуццё самасвядомасці. У сувязі з гэтым Цяпінскі шырэй і смялей, чым яго папярэднікі, уводзіў у мову сваіх твораў элементы жывой гутарковай мовы беларускага народа. Праўда, яго мова, хоць і не была яшчэ чыста народнай, але значна далей, чым мова Скарыны, адышла ад архаічнай і маларазумелай для простых людзей мовы царкоўна-славянскай пісьменнасці культавага прызначэння» [4, с. 61-62].

Трэба падкрэсліць, што значную ролю ў развіцці і дэмакратызацыі школьнай асветы адыгралі праваслаўныя брацтвы і супрацоўніцтва з імі вядомых тады рэлігійных дзеячаў, педагогаў Лаўрэнція Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, Спірыдона Собаля і інш. У школах, якія былі адчынены брацтвамі, маглі займацца выхадцы з розных саслоўяў, хоць большую частку вучняў складалі дзеці сярэдніх саслоўяў, галоўным чынам гараджан, праваслаўнага духавенства, дробнай шляхты. Сацыяльны і маёмасны стан улічваўся і пры аплаце за навучанне; мелі месца, і гэта трэба падкрэсліць, спробы стварэння класна-урочнай сістэмы навучання (Віленская школа). У гэтых школах, як і ў іншых навучальных установах, праграмы навучання абапіраліся на еўрапейскія прынцыпы: у іх аснову былі пакладзены так званыя «семь свободных искусств». Асаблівая ўвага ў брацкіх школах адводзілася царкоўнаславянскай, грэчаскай мовам, вывучаліся лацінская і польская мовы, а таксама і «руская», г.зн., беларуская мова. Заслугай брацтваў было і тое, што яны наладжвалі выпуск вучэбнай літаратуры, у тым ліку і такіх важных выданняў, як «Азбука» і «Грамматика словенская» Л.Зізанія, «Грамматика словенская» М.Сматрыцкага. З 1590 да 1654 гадоў беларускія друкары выпусцілі 16 буквароў (з іх 8 брацкіх), – больш за палову ўсіх аналагічных выданняў, выдадзеных у той час на ўсходнеславянскіх землях [5, с. 57]. Мы падзяляем думку тых навукоўцаў, якія лічаць, што ва ўмовах, калі ўзмацнілася паланізацыя і акаталічванне насельніцтва Беларусі, рабіліся спробы разбурыць і знішчыць усялякія парасткі нацыянальнай культуры і асветы, дзейнасць брацкіх школ, як і саміх праваслаўных брацтваў, мела не толькі асветніцкае, але і грамадска-палітычнае значэнне [6, с. 62].

Разам з тым трэба адзначыць, што нельга не ўлічваць і тую дзейнасць у галіне асветы, адукацыі, якую праводзіла на Беларусі каталіцкая царква. Яе заслуга не толькі ў тым, што яна стварыла даволі шырокую сетку навучальных устаноў, у тым ліку і першую ва Усходняй Еўропе вышэйшую навучальную ўстанову, але і ў тым, што садзейнічала ўсталяванню тут заходнееўрапейскай сістэмы адукацыі. Невыпадкова каталіцкія калегіумы, Віленская духоўная акадэмія лічыліся лепшымі на той час навучальнымі ўстановамі, прычым, акрамя католікаў, у іх

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

навучылася шмат дзяцей праваслаўных і пратэстантаў. Адсюль выйшлі многія выдатныя беларускія мысліцелі, напрыклад, М. Сматрыцкі, К. Лышчынскі, інш. Трэба мець на ўвазе і той факт, што у каталіцкіх калегіумах вывучалася беларуская мова (Полацкія езуіты, напрыклад, у 1584 г., каб прывабіць у сваю калегію беларусаў "стали обучать их детей русским письменам").

Такім чынам, другая палова XIII – першая палова XVII стст. сталі важным перыядам у развіцці як педагагічнай думкі, так і школьнай сістэмы, усей асветы на Беларусі. Менавіта тады з'явілася шмат розных навучальных устаноў, адукаваных настаўнікаў, быў выдадзены шэраг падручнікаў, сфарміравалася пэўная арганізацыйная структура вучэбнага працэсу, методыка выкладання, тым самым закладваўся добры падмурак для далейшай дзейнасці па ўсіх гэтых напрамках.

Істотныя змены адбыліся ў гэты час ў развіцці юрыдычных ведаў, прававой культуры. Прычым ужо з канца XV ст. узмацніўся працэс замены звычаёвага права (склалася яшчэ ў старажытны час) правам пісаным, з юрыдычна абгрунтаванымі нормамі, замацаванымі ў спецыяльных актах агульнадзяржаўнага характару. Такімі актамі сталі вялікакняжацкія граматы ці прывілеі, у якіх даволі поўна і грунтоўна былі выкладзены не толькі правы шляхты, але і некаторыя прынцыпы крымінальнага, грамадзянскага і дзяржаўнага права. Далейшаму развіццю прававой культуры ВКЛ садзейнічала кадыфікацыя заканадаўства, якая адбылася на аснове Судзебніка 1468 г., вядомага як Судзебнік Казіміра. Менавіта гэты Судзебнік усталяваў аднастайнасць прымянення прававых нормаў на ўсёй тэрыторыі краіны, унёс некаторыя новыя паняцці ў крымінальнае права. Буйнейшым дасягненнем у развіцці прававой думкі ВКЛ, Беларусі стала распрацоўка Статутаў. Як вядома, было тры рэдакцыі гэтых Статутаў. Найбольш дасканалым з іх з'яўляецца Статут ВКЛ 1588 г. Аналізуючы Статуты, перш за ўсё трэба падкрэсліць той факт, што яны з'явіліся першым у Еўропе выданнем законаў, якія былі створаны на аснове кадыфікацыі мясцовага права і ў іх найбольш поўна, найбольш прыкметна праявілася прававая культура беларускага народа. Такую ацэнку Статутаў ВКЛ даюць практычна ўсе даследчыкі. Важна і яшчэ адна асаблівасць – Статуты былі напісаны на беларускай мове, гэта цяпер агульнапрызнаны факт. Дарэчы, большасць законаў краін феадальнай Еўропы была напісана на лацінскай мове. Пры распрацоўцы Статутаў і, у прыватнасці, Статута 1588 г., складальнікам удалося вырашыць шэраг складаных тэарэтычных і практычных задач, зыходзячы як з ранейшых традыцый, так і з улікам ідэй, увасобленых эпохай Адраджэння і Рэфармацыі. Ідэі гуманізму, напрыклад, адбіліся на нормах крымінальнага і цывільнага права. Так, у пэўнай ступені гарантаваліся маёмасныя і асабістыя правы мяшчан. Кожны вольны чалавек мог пры жаданні выехаць за мяжу, калі гэта рабілася не на шкоду сваёй краіне. Уводзіліся нормы, скіраваныя на абарону простага чалавека ад самавольства прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя. Цяпер шляхта за наўмыснае забойства селяніна не магла адкупіцца толькі грашовым штрафам, а прыцягвалася да крымінальнай адказнасці. Ужо першы Статут ВКЛ абмежаваў рабства ці няволю, дакладна вызначыў яго прычыны і крыніцы. Трэці Статут у гэтым напрамку пайшоў далей. Замест чатырох прычын няволі ў Першым і трох – у Другім, Трэці Статут пакінуў толькі адну – ваенны палон, і то з выключэннямі (арт.21, раздзел XII). У гэтым жа Статуце нават выдалена сама назва "нявольнік", наказана нявольнікаў у будучым называць "дворная чэлядзь" [7, с. 322]. Безумоўна, нельга ідэалізаваць Статуты ВКЛ, у тым ліку і Статут 1588 г. Гэта быў кодэкс сваёй эпохі і абараняў ён інтарэсы магнатаў і шляхты, замацаваў іх пануючае становішча ў дзяржаве, канчаткова запрыгоніў сялян.

Усё большую ўвагу тады прыцягвалі да сябе філасофскія і сацыяльна-палітычныя праблемы. Філасофія як пэўная сістэма поглядаў, паняццяў і катэгорый

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

фарміравалася на ўсходнеславянскіх землях ужо ў раннім сярэднявеччы, эпоху Старажытнай Русі. Праўда, у той час яна яшчэ не вылучылася ў самастойную форму ведаў і разумелася як "мудрость вообще". Але і тады айчынныя мысліцелі падымалі самыя розныя пытанні жыцця людзей, іх светапогляду, развіцця грамадства. Распрацоўка гэтых пытанняў працягвалася і ў другой палове XIII – першай палове XVII стст. Прычым філасофская думка Беларусі развівалася ў агульнаеўрапейскім рэчышчы і абагачалася тымі дасягненнямі, якія парадзіла эпоха Адраджэння і Рэфармацыі. Гаворка ідзе, у прыватнасці, аб ідэях гуманізму. Яны праследжваюцца ўжо ў дзейнасці Ф.Скарыны. Менавіта ён стаяў ля вытокаў гуманістычнага напрамку ў развіцці грамадскай думкі Беларусі і адным з першых "імкнуўся перагледзець артадаксальна-хрысціянскае тлумачэнне праблемы чалавечага існавання, згодна з якім зямное жыццё чалавека не мае першаснага азначэння. Ён рэабілітуе зямное быццё, сцвярджае самацэннасць чалавечага жыцця, не адвяргаючы ў той жа час і веру ў замагільнае жыццё" [8, с. 101]. Ідэалам для Ф.Скарыны з'яўляецца высокамаральная, грмадска актыўная асоба, якая імкнецца не толькі да самапазнання, але і да самаўдасканалення, развіцця. З такіх пазіцый Ф.Скарына разглядаў і сваю кнігавыдавецкую дзейнасць. Біблейскія кнігі, якія ім былі надрукаваныя, прызначаліся шырокім слаям насельніцтва, людзям простым, каб «братия моя Русь, люди посполитые, чтучи могли лепей разумети» [9, с. 37].

Усё больш шырокае распаўсюджанне на Беларусі атрымлівалі і ідэі рацыяналізму, матэрыялізму, што мелі нават атэістычную накіраванасць. Гэтаму ў значнай ступені спрыяў рэфармацыйны рух. Наступствам Рэфармацыі ва ўсіх еўрапейскіх краінах стала не толькі нараджэнне верацярпімасці, рэлігійнае абнаўленне, але і кардынальныя змены ў чалавечым светаадчуванні, светаразуменні, у тым ліку і новае разуменне бога і чалавека. Даследчыкі адзначаюць, што тады адбыўся як бы падзел веры, розуму і прыроды. У ліку беларускіх мысліцеляў, погляды якіх развіваліся ў такім кірунку, мы павінны вылучыць перш за ўсё С.Буднага – аднаго з ідэолагаў т.зв. антытрынітарыяў, найбольш радыкальнай плыні рэфармацыйнага руху на Беларусі. С.Будны не толькі крытычна адносіўся да біблейскіх кніг, але і паставіў пад сумненне асноўныя дагматы хрысціянства. Увогуле прынцып сумнення ён разглядаў як важную метадалагічную перадумову пазнання, а крыніцай пазнання лічыў чалавечы розум. У сваіх творах і выступленнях С.Будны неаднаразова падкрэсліваў, што чалавек не павінен спадзявацца на веру, а абавязаны дамагацца ўсяго розумам, абапіраючыся на жыццёвы вопыт[10, с. 58].

Не абышлі нашы айчынныя мысліцелі і праблемы, якія мелі дачыненне да становішча асобы ў дзяржаўнай сістэме, яе правоў і свабоды дзейнасці, ролі закона і права. Фактычна тады даволі дакладна была сфармулявана і абгрунтавана ідэя прававой дзяржавы, неабходнасці рэгулявання грамадскага жыцця на аснове закона, абмежавання самаўпраўства і свавольства феадалаў і ўлад, у тым ліку і самога манарха. Гэта ідэя была выказана Ф. Скарынам і атрымала далейшае развіццё ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. у працах М. Тышкевіча (М. Літвіна), А. Волана, Л. Сапегі, якія прадстаўлялі свецкі напрамак у сацыяльна-палітычнай думцы Беларусі. Трэба зазначыць, што яна знайшла пэўнае адлюстраванне ў дзеючым заканадаўстве ВКЛ і, у прыватнасці, у Статутах Княства. Так, ёсць пэўныя падставы сцвярджаць аб мажлівым удзеле Ф. Скарыны ў рапрацоўцы і падрыхтоўцы Статута ВКЛ 1529 г. [11]. Падрыхтоўкай і выданнем Статутаў ВКЛ 1566 і 1588гг. непасрэдна займаліся вядомыя тады дзяржаўныя дзеячы А. Валовіч і Л. Сапега. Актыўна выступалі за правядзенне адпаведных рэформ у ВКЛ М. Тышкевіч, А. Волан і інш.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Безумоўна, грамадская думка Беларусі развівалася не толькі паводле вылучаных намі накірункаў. Гэта была шырокая сфера творчай дзейнасці, якая закранала ўсе гуманітарныя навукі, і ва ўсіх іх беларускія мысліцелі пакінулі свой след. Пры гэтым важнейшым кампанентам духоўна-культурнага развіцця Беларусі з'явілася станаўленне нацыянальна-этнічнай самасвядомасці, што знайшло адлюстраванне ў грамадска-філасофскай думцы, сачыненнях Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, В. Цяпінскага, С. Зізанія, С. Буднага, А. Волана, Л. Сапегі і іншых. Дзякуючы іх намаганням ужо тады былі сфармуляваны і абазначаны асноўныя ідэі самасвядомасці беларусаў, у прыватнасці, ідэі дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага суверэнітэту (у межах ВКЛ), захавання і развіцця роднай мовы, назапашаных духоўна-рэлігійных каштоўнасцей у сувязі з дыскрымінацыйнай палітыкай, якую праводзілі правячыя колы Рэчы Паспалітай [12, с. 12-26; с.38-69].

Такім чынам, і ў навуковай сферы, і ў грамадскай думцы разглядаемага перыяду адбываліся важныя змены. Яны вызначаліся самім жыццём, запатрабаваннямі людзей і адлюстроўвалі дасягненні не толькі беларускага народа, але і іншых народаў ВКЛ, Рэчы Паспалітай. Прычым культурна-гістарычны прагрэс на Беларусі развіваўся на аснове сінтэзу мясцовых традыцый і еўрапейскіх тэндэнцый і, у прыватнасці, тых, што былі звязаны з эпохай Адраджэння.

## ЛІТАРАТУРА


1. Падрабязна гл.: ***Перцаў В.Н.*** Гістарычная думка на тэрыторыі Беларусі паводле даных ранняй народнай творчасці і летапісаў// Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1956. – № 3 – С. 5. Гл. таксама: ***Салавей Л.М.*** Беларуская гістарычная балада // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1972. – № 4 – С. 123-133.
2. Очерки науки и культуры Беларуси. IX – начало XX вв. – Мн., 1996.
3. Там жа.
4. Там жа.
5. ***Парашкоў С.А.*** Гісторыя культуры Беларусі: Вучэбны дапаможнік. – Магілёў, 2001.
6. ***Акинчиц И.И.*** Братские школы Беларуси // Материалы научно-богословской конференции, посвященной памяти преподобного мученика Афанасия игумена Брестского и 400-летию Брестских церковных соборов. Брест. 16-19 сентября 1996 г. – Мн., 1997.
7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведкі. Каментарыі. – Мн., 1984.
8. Очерки науки и культуры Беларуси. IX – начало XX вв.
9. ***Скарына Ф.*** Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. – Мн., 1990.
10. ***Старостенко В.В.*** История общественно-философской мысли средневековья и Возрождения в Беларуси: Учебное пособие. Могилев,1996.
11. Версія аб тым, што Ф. Скарына мог браць удзел у распрацоўцы Статута ВКЛ 1529 г. была выказана і абгрунтавана беларускім гісторыкам Я. Юхо. Гл.: ***Юхо Я.*** Грамадскія і прававыя погляды Скарыны // Полымя. – 1967. – № 6. – С. 175.
12. ***Старостенко В.В.*** Общественно-философская мысль и национальное самосознание белорусов XVI – XVII вв.: Очерки истории. Учебное пособие. – Могилев. 1999; Он же. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X – XVII вв.). – Могилев, 2001.


## SUMMARY

*The condition and the development of scientific knowledge and social conception in Belarus during the given period are analysed in the article, trends of knowledge accumulation in humanities as well as problems raised and discussed then being considered by the author. A well-grounded conclusion has been drawn that all these problems were put by life it self, by needs of society and people, and were developed on the basis of synthesis of local traditions and European tendencies and achievements.*

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова